«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне».
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Справа Бабкіна: Набраў нумар міліцыі 102 і абразіў прэзідэнта

28.06.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Аляксандр Бабкін у судзе.

У судзе Кастрычніцкага раёна Гродна 28 чэрвеня адбыўся разгляд крымінальнай справы мясцовага жыхара Аляксандра Бабкіна, якога абвінавацілі у абразе прэзідэнта Беларусі (ч. 1 арт. 368 КК).

Справу разглядаў суддзя **Уладзімір Пазняк**, дзяржаўны абвінаваўца – **Дар'я Гур'янава.**

Маніторынг судовага працэсу ажыццяўляў праваабаронца **Раман Юргель.**

Справа была ўзбуджаная 25 красавіка, трое сутак Бабкін знаходзіўся ў ІЧУ, затым пад падпіскай аб нявыездзе.

Паводле абвінавачвання, Бабкін, знаходзячыся ў алкагольным ап'яненні, патэлефанаваў на нумар 102 і зневажальна і негатыўна выказаўся на адрас прэзідэнта, прынізіў ягоныя гонар і годнасць, тым самым нанёс публічную абразу.

Сваю віну прызнае цалкам.

- Па якой прычыне вы тэлефанавалі? - пытаецца пракурор

- Да мяне пасля прэзідэнцкіх выбараў у дзверы некалькі разоў ламілася міліцыя і АМАП, я не адчыняў, баяўся. 10 жніўня я быў затрыманы і аштрафаваны.

> Аляксандр Бабкін у ноч з 10 на 11 жніўня 2020 падчас пратэстаў у Гродна быў затрыманы, адпраўлены ў СІЗА і закрытым выязным судом на наступны дзень быў аштрафаваны на 15 базавых велічынь.

Суддзя*: "А чаму вы самі не пайшлі ў міліцыю высветліць мэту іх візітаў, па якой прычыне вы абражалі кіраўніка дзяржавы?*"

> *- Я быў п'яны і патэлефанаваў, не даваючы сабе справаздачы. Я разумею, што здзейсніў злачынства. Больш такога не паўторыцца.*

Сведка **Ганна Самойленка** працуе тэхнікам сувязі службы міліцыі, прымала той званок:

> *- Грамадзянін Аляксандр Бабкін патэлефанаваў ноччу і спытаў, ці знаходзіцца ён у вышуку і выказаўся нецэнзурнай лаянкай. Размовы на палітычную тэму не было. Было зразумела, што чалавек нападпітку. Мы бачылі нумар тэлефона і на каго ён зарэгістраваны.*

Размова доўжылася 4 хвіліны. Самойленка запоўніла картку і паводле службовых абавязкаў перадала інфармацыю аператыўнаму дзяжурнаму і ў РАУС.

Наступная сведка **Лідзія Каханская**, тэхнік сувязі службы міліцыі 102 Гродзенскага УУС, патлумачыла, што чула гэты званок пры паўторным праслухоўванні.

Чула, што грамадзянін Бабкін, спытаў, ці знаходзіцца ён у вышуку, затым назваў прозвішча Лукашэнкі і нецэнзурна выказаўся ў яго адрас.

Пракурор удакладняе паказанні сведак: *"Тэлефанаваў і абражаў прэзідэнта?"*

> *- Так, пацвярджаю. Па размове было зразумела, што п'яны быў.*

У часе судовых спрэчак пракурор казаў, што Бабкін злоўжывае алкаголем, прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці ў жніўні 2020 за пікетаванне. Віна пацвярджаецца сабранымі доказамі, паказаннямі сведак-тэхнікаў сувязі міліцыі, пратаколамі агляду, экспертным заключэннем і матэрыяламі справы.



Пасля абвяшчэння прысуду Аляксандру Бабкіну.

Па заключэнні эксперта **Фіялавай**, выказаўся ў адрас Прэзідэнта зняважлівымі словамі. Наўмысна абразіў прэзідэнта, разумеў, што наносіць шкоду і прыніжае аўтарытэт гонар і годнасць Прэзідэнта.

Пракурор, улічваючы раскаянне абвінавачанага, просіць прызначыць яму пакаранне тэрмінам на адзін год у калоніі агульнага рэжыму, узяць пад варту ў зале суда. Таксама патрабуе прымяніць прымусовае лячэнне ад алкагалізму.

Адвакат даводзіў, што Бабкін не ўяўляе небяспекі для грамадства, можа быць пакараны і штрафам. Просіць суд абвясціць пакаранне выпраўленчымі працамі без акіравання ва ўстанову адкрытага тыпу.

Суд пастанавіў прызнаць Аляксандра Бабкіна вінаватым па ч. 1 арт. 368 КК і прызначыць яму **адзін год пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму**, таксама прымяніць прымусовае лячэнне ад алкагалізму. Мабільны тэлефон канфіскаваны, кампутар і клавіятуру - вярнуць асуджанаму.

Пад час заключэння пад варту Бабкін паспеў выгукнуць “Жыве Беларусь!” і “Будзем вольнымі“.

Опубликовать



Вясна. Правы чалавека ў ...
10 215 подписчики









Суседства з паразітамі ў месцах пазбаўлення волі – грубае парушэнне міжнародных стандартаў утрымання

У эфіры БТ паказалі фільм пра палітвязняў палякаў і былога вайскоўца, асуджанага за "здраду дзяржаве"

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

Памілаванні, узмацненне пакаранняў, новыя крымінальныя справы: агляд навінаў пра палітвязняў за лістапад



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2024



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Канвеер несхаванай цэнзуры". Тлумачым, як у Беларусі прызнаюць матэрыялы "экстрэмісцкімі"

Суседства з паразітамі ў месцах пазбаўлення волі – грубае парушэнне міжнародных стандартаў утрымання

Суседства з паразітамі ў месцах пазбаўлення волі – грубае парушэнне міжнародных стандартаў утрымання

Больш за паўгода сваякі не маюць сувязі з палітвязнем Андрэем Навіцкім

650 чалавек у Беларусі асудзілі за "распальванне іншай сацыяльнай варожасці"

"Гэта дазваляе паказаць выяўленыя падчас выбараў праблемы". Што важна ведаць пра незалежнае назіранне за выбарамі*

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2025

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections epde













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

